■ Восеньскі кірмаш

# ЧАРГА ПА АМУРА І ГРУШУ, А ДЗЕ Ж ЮШКА?

## Карэспандэнты «Звязды» ў мінулую суботу пабывалі на кірмашах па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі ў Віцебску і Брэсце



**Угорадзе на Дзвіне каля канцэртнай залы «Віцебск» гандляваць пачалі а 9-й гадзіне раніцы. І адразу выстраіліся чэргі на тое, што прадавалася па прывабных цэнах.**




У прыватнасці, па грушы коштам 50 капеек за кіло. Хай фрукт быў і не найлепшай якасці, але бралі, ды яшчэ як! У тым жа гандлёвым пункце прапаноўвалі набыць за 1 рубель кілаграм яблыкаў. І народ таксама ахвотна купляў.

Традыцыйна, як гарачыя піражкі, разбіралі жывую рыбу. Рыбгас з Пастаўскага раёна, дарэчы, рэалізуе яе і ў працоўныя дні. Для гэтага спецыяльна з далёкай глыбінкі ў абласны цэнтр прыязджае рыбавоз, каб перагрузіць жывы тавар у аўто, з якога гандлююць. Як падкрэсліў прадаўцы, цэны на ўзроўні леташніх. У прыватнасці, кіло амура каштуе 4,6 рубля, карпа — 4 рублі 25 капеек.

Па бульбу чэргаў не было. Мо таму, што цана — прыкладна такая ж, як у крамах, — 35—40 капеек за кіло. З многіх прыватных «аўталавак» прапаноўвалі купіць 32 кілаграмы бульбы ў сетцы за 12 рублёў.

Цыбулю можна было купіць па цане ад 70 капеек да 1 рубля 30 капеек за кілаграм, капусту — за 35—40 капеек, памідоры — за 1 рубель 15 капеек.

На кірмашы быў багаты выбар саджанцаў: яблыні — па 6 рублёў, вішні, слівы, чарэшні — 10 рублёў, вінаград — ад 8 да 15 рублёў.

У «меню» кірмашу былі і мясныя паўфабрыкаты, каўбасныя вырабы з мінімальнай гандлёвай нацэнкай. У гэты дзень, бадай, ніхто не сышоў без пакупак.

На суб'ектыўны погляд журналістаў «Звязды», не хапала музыкі, юшкі і чаркі.

Не першы раз раблю рэпартажы з аналагічных мерапрыемстваў. Дык заўважыў, што, калі праз дынамік гучаць песні, прахожыя мімволі заходзяць паглядзець на гандлёвыя рады. Несумненна, настрой падымаецца. А як цудоўна паесці смачнай гарачай юшкі, калі надвор'е ўжо, як той казаў, не майскае.



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Кірмашы ў Віцебску, як паведамілі ў гарвыканкаме, будуць праходзіць штотыдзень па суботах па 28 кастрычніка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

### ЦЭНЫ Ў БРЭСЦЕ

ВОСЕНЬСКІЯ кірмашы ў Брэсце будуць праходзіць кожную суботу да канца кастрычніка. Адной з галоўных пляцовак па продажы сельгаспрадукцыі стаў усходні мікрараён. Сёлета выдаўся не вельмі ўрадлівы год на яблыкі, таму цана на іх трымаецца даволі высокая. І калі сельгаспрадпрыемства «Астрамечава» прапанавала яблыкі па 52 капейкі, то каля машыны выстраілася немалая чарга. Дарэчы, гэтыя вытворцы прадавалі натуральны яблычны сок па 3,34 рубля за трохлітровы пакет. І прадукцыю бралі. У асноўным жа цэны былі прыблізна аднолькавыя, яны разыходзіліся ў залежнасці ад якасці і таварнага выгляду прадукцыі. Так што ў пакупніка выбар быў.

Табліца кошту садавіны і агародніны ў беларускіх рублях на гэтым кірмашы выглядае прыкладна так:

бульба 0,30—0,35;
капуста 0,30—0,39;
буракі 0,30—0,40;
морква 0,40—0,48;
перац 1,50—2,60;
цыбуля 0,52—0,60;
часнок 4,80—6,44;
памідоры 1,00—1,50;
яблыкі 1,15—1,65;
журавіны 4,30—4,60.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Купляй сваё!

### Такіх футраў няма нават у Грэцыі

**У Магілёве адкрылася крама, дзе прадаюцца вырабы выключна айчыннай вытворчасці**

Асартымент уражвае — норка, чарнабурка, пясец у арыгінальным выкананні, прычым не толькі для жанчын, але і для мужчын. У сярэднім вырабы каштуюць ад 1,5 тысячы да 5,2 тысячы рублёў.

— Нашы вырабы зроблены з беларускай пушніны, якую пастаўляюць шэсць звераагаспадарак Белкаапсаюза, — паведаміла **начальнік упраўлення прадпрыемства «Белкаапзнешгандаль» Белкаапсаюза Ганна АЛЯКСЕЕВА.** — Тут вырошчваецца найбольш запатрабаваная сёння норка скандынаўскага тыпу — белая, жамчужная і чорная. Адным словам, самі вырошчваем, апрацоўваем і прадаём. Для пашыву выкарыстоўваюцца толькі цэльныя пласціны. Нават Грэцыя не можа пахваліцца такой якасцю. Нашы спажыўцы па спецыяльным штрыхкодзе на цэнніку могуць атрымаць поўную інфармацыю пра паходжанне сваёй пакупкі.

Летась прадпрыемства ўвайшло ў лік фіналістаў міжнароднага конкурсу маладых дызайнераў «Рэмікс-Еўразія 2016». А сёлета яго вырабы прызнаны найлепшай калекцыяй верхняга адзення на міжнародным форуме футравай моды MOSFUR у Маскве.

На ўрачыстае адкрыццё крамы завітаў мэр Магілёва Уладзімір Цумараў. Разам са старшынёй праўлення Белкаапсаюза Валерыем Іванавым ён перарэзаў чырвоную стужку на ўваходзе.

— Новы аб'ект, магчыма, па памерах і невялікі, але можна не сумнявацца, што ён будзе запатрабаваны, — лічыць мэр. Ён пажадаў гаспадарам крамы поспехаў і выдатнага таваразвароту.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# ЗЛЁТ У «ЗУБРАНЯЦІ»

## Юныя ратавальнікі сабраліся на Нарачы

**Верасень у лагеры адпачынку «Зубраня» традыцыйна звязаны з Рэспубліканскім злётам юных ратавальнікаў-пажарных. Сёння ён праходзіў ужо дваццаты раз. Каля 200 юнакоў і дзяўчат з'ехаліся з усіх куткоў Беларусі, каб прадэманстраваць свае ўменні дзейнічаць у экстрэмальных сітуацыях.**



Фота Алены ЖАЛАБКОВІЧ.

Маляўнічая цырымонія закрыцця злёту суправаджалася кадрамі з архіва «Зубраняці». Нават і не верылася, што падлеткі, вывы якіх захаваліся на паўсцёртых ад старасці стужках, зараз стаяць на сцэне ўжо дарослымі людзьмі. Шмат хто з іх звязаў свой лёс з прафесіяй ратавальніка. Напрыклад, **Павел ФІЛІМОНАЎ** прыехаў на злёт з дачкой:

— Шаснаццаць гадоў таму я быў капітанам сталічнай каманды, якая заняла трэцяе агульнакаманднае месца. Вучыўся тады ў дзявятым класе і пасля паездкі сюды адразу зразумеў, што з выбарам прафесіі я ўжо вызначыўся. Таму сярэднюю адукацыю атрымліваў ужо ў спецыялізаванай школе, а пасля пайшоў у Камандна-інжынерны інстытут.

За гэты час у «Зубраняці» шмат што змянілася. Але галоўнае дзеці мала таго што адпачываюць, — атрымліваюць навыкі, якія могуць спатрэбіцца, калі давядзецца дзейнічаць на аўтаматызме, бо часу на роздум ужо не будзе. А яшчэ тут завязваюцца трывалыя сяброўскія стасункі, якія працягваюцца не адзін год.

У 2001 годзе, — працягвае Павел Філімонаў, — наша каманда заняла першае месца ў конкурсе ратавання на водах. А наступным летам мне давялося ўжо ратаваць чалавека. Я тады адпачываў на возеры са сваім стрыечным братам. Трымаўся на вадзе ён не вельмі добра, але ўсё-такі паспрабаваў даплыць да сярэдзіны вадаёма і назад. І вось у цэнтры возера ён пайшоў пад ваду. Я ўбачыў гэта, падплыў і, як мог, адбуксіраваў яго на бераг. Той выпадак ён памятае дагэтуль. І кожны раз дзякуе, што тады я яго выратаваў.

Арганізатары стварылі вельмі насычаную праграму злёту. За тры тыдні школьнікі прайшлі праз вялікую колькасць конкурсаў — «Конкурс вясёлых і знаходлівых», «Агляд строю», «Ратаванне на вадзе», «Аказанне першай дапамогі»... Але самымі відовішчнымі сталі зводныя палявыя вучэнні.

— Яны складаліся з васьмі этапаў, — кажа капітан каманды з Мінска, вучань 10-га класа СШ №143 **Арцём ВАЎЧОК.** — У нас было баявое разгортванне пажарнага разліку, мы мусілі выратаваць людзей з верталёта, які пацярпеў катастрофу, паказаць дзеянні пры хімічнай атацы... Адным словам, умовы былі набліжаны да рэальных.

Арцём раней быў юным інспектарам дарожнага руху. Аднак яму прапанавалі паспрабаваць сябе ў ролі ратавальніка. Хлопец пагадзіўся і, як бачым, не прагадаў. Але наколькі лёгка трапіць у гэтыя шэрагі?

— Каб стаць членам каманды, мала мець толькі добрую фізічную падрыхтоўку, — кажа ўдзельніца злёту **Ангеліна ЛУКАШЭВІЧ.** — Яшчэ неабходна і добра вучыцца. Гэта паказчык дысцыплінаванасці чалавека.

Пра добрую вучобу ішла гаворка і на спецыяльнай прэс-канферэнцыі. Яе ўдзельнікамі сталі міністр па надзвычайных сітуацыях, кіраўнікі абласных упраўленняў ведамства, а таксама начальнік Універсітэта грамадзянскай абароны. Многім удзельнікам злёту ўжо давядзецца праз год-другі абіраць сабе прафесійны шлях.

— Умовы паступлення з рэарганізацыяй нашай установы не змяніліся, — кажа **начальнік Універсітэта грамадзянскай абароны Іван ПАЛЯВОДА.** — Але для выпускнікоў спецыялізаванага ліцэя пры нашай установе захоўваецца льгота. Яна дазваляе хлопцам, якія паспяхова вучацца па профільных дысцыплінах — матэматыка, фізіка, мовы, — паступаць без дадатковых іспытаў. Галоўнае — мець адзнакі ў сем балаў і вышэй.

У «Зубраня» штогод прыязджаюць юныя ратавальнікі з іншых краін. Сёлета ў нас гасцявала дэлегацыя з Грузіі.

— Два гады да нас прыязджалі італьянцы, — гаворыць **міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.** — Завітвалі і пакістанцы. Былі ў нас і госці з Кітая, Японіі, Турцыі. Хлопцы з Германіі сабраліся прыехаць. Адным словам, мы адкрытыя і гатовы прыняць усіх. Галоўнае — жаданне.

Сёлета пераможцамі злёту стала каманда са сталіцы. Другое месца — у прадстаўнікоў Магілёўшчыны. Ну а «бронзу» з Мядзельшчыны павезлі дадому прадстаўнікі Гомельскай вобласці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*